Created in Master PDF Editor - Demo Version

# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 4(74) 2012

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

***Галоўны рэдактар***
**П.Д. Кухарчык**

***Рэдакцыйная калегія:***

В.В. Бушчык (*нам. галоўнага рэдактара*)
Л.М. Давыдзенка
А.В. Данільчанка
А.П. Жытко
М.М. Забаўскі
І.В. Катляроў
П.В. Кікель
Г.А. Космач
А.М. Люты
У.А. Мельнік
А.І. Смолік
А.С. Цернавы
В.С. Цітоў
В.В. Шынкароў

## Змест

### Гісторыя

*Жытко А.П., Талмачова С.А.* Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Беларусі (канец XVIII – першая палова XIX ст.) ....3

*Лашкевіч С.А.* Знешнепалітычная пазіцыя Вялікага Княства Літоўскага ва ўзаемаадносінах Рэчы Паспалітай і Маскоўскай дзяржавы ў 1597–1598 гг. ....7

*Рацько А.Ф.* Айчынная гістарыяграфія перадумоў адмены прыгону на тэрыторыі Беларусі ....10

*Пуцік У.С.* Незавершанасць аграрнага рэфармавання як фактар палітычнага крызісу ў Расійскай імперыі ў пачатку XX ст. (на прыкладзе Беларусі) ....14

*Осіпава Т.М.* Дзейнасць органаў фабрычна-заводскага надзору ў Беларусі (1882–1914 гг.) ....18

*Калечыц І.Л.* Памінальныя запісы XV–XVI стст. у алтары Спаса-Праабражэнскай царквы г. Полацка ....23

*Кадзіра У.М.* Уцёкі і перасяленні сялян як адна з форм антыфеадальнай барацьбы беларускага і ўкраінскага народаў у другой палове XVI – першай трэці XVII ст. ....28

*Палікоўская Т.І.* Наладжванне музейнай справы езуітамі на беларускіх землях у айчыннай гістарыяграфіі ....33

*Космач П.Г.* Научные связи М. Почобута-Одляницкого с российскими учеными ....36

*Бруханчык К.А.* Адлюстраванне дзейнасці крэдытных устаноў на тэрыторыі Беларусі ў перыядычным друку (пачатак XX ст.) ....39

*Мацюш П.А.* Вышэйшая гістарычная адукацыя ў БССР (1960-я – першая палова 1980-х гг.): аналіз структуры і зместу ....42

*Ярмац А.А.* Мабілізацыя ў Чырвоную армію на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў II палове 1944–1945 гг. ....46

*Гарбицкий С.Б.* Белорусско-чешское экономическое сотрудничество во второй половине XX – начале XXI в. ....50

*Субоцін А.Г.* Пруска-германскі дуалізм у 1920-я гг. ....54

*Старычонак В.В.* Ваенна-палітычная стратэгія ЗША канца XX – пачатку XXI ст. ....59

*Кошалева Н.У.* «Ісламскі заклік» і рэпрэзентатыўнасць вобраза ісламу і мусульман у навуковых колах ЗША ....62

*Кавяка І.І.* Геапалітычныя наступствы аб'яднання Германіі для Вялікабрытаніі і Еўропы ....66

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



піс інфармаваў чытачоў аб станоўчым вопыце стварэння асобных крэдытных кааператываў, становішчы дробных крэдытных арганізацый, удзеле мясцовых улад (земстваў) у кааператыўным руху, размяшчаў балансы некаторых таварыстваў, віншаванні з юбілеем дзейнасці. Выданне таксама публікавала інфармацыю аб замежных капітапах, банках і банкірскіх канторах, рэвізіях, якія праводзіліся Міністэрствам фінансаў [12].

Такім чынам, вывучэнне зместу фінансавай прэсы дазваляе зрабіць вывад аб сувязі значнай колькасці прыватных біржавых выданняў з буйнымі акцыянернымі таварыствамі, бан- камі і прадпрыемствамі, якія ўдзельнічалі ў іх адкрыцці і фінансаванні. Ведамасныя выданні адрозніваліся афіцыйным характарам публікацый, аб'ектыўнасцю і даступнасцю інфармацыі. Спецыялізаваныя часопісы, якія размяшчалі на сваіх старонках інфармацыю аб дзейнасці сярэдніх і дробных крэдытных устаноў, падавалі дакладныя звесткі, садзейнічалі папулярызацыі крэдытнай кааперацыі ў Расійскай імперыі, тлу- мачылі палажэнні законаў, прыводзілі станоў- чыя прыклады стварэння крэдытных устаноў. Нягледзячы на суб'ектыўны характар шэрагу выданняў, яны ўяўляюць пэўную каштоўнасць для даследчыкаў, паколькі дапамагаюць выявіць характар узаемаадносін паміж прэсай і фінансавым капіталам, асвятляюць дзейнасць шэрагу банкаў, дапамагаюць ацаніць ступень іх уплыву на сацыяльна-эканамічнае развіццё.

ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ

1. Бнржевая пресса // Экономмческая мсторня Россни (с древнейішх времен до 1917 г.): энцнклопедня: в 2 т. - М.: РОССПЭН, 2008. — Т. 1.-С. 227.
2. *Боханов, А.Н.* Буржуазная пресса Росснн н крупный капн- тал. Конец XIX в. -1914 г. / А.Н. Боханов. - М.: Нзд-во «Нау- ка», 1984.-152 с.
3. *Буданов, Г.* Пнсьмо в редакцню / Г. Буданов // Московскмй вестнмк ломбардов. -1912. - № 20. - С. 53-54.
4. Вестннк взанмного нпотечного кредnта. -1913. - № 1.
5. Вестнмк мелкого креднта (Нзданне управленмя по делам мелкого креднта). -1912. - № 1-5.
6. *Воронцова, ЕА.* Вестннк фннансов, промышленноста н торговлн / Е.А. Воронцова // Экономнческая нсторня Росснн (с древнейшнх времен до 1917 г.): знцмклопедня: в 2 т. - М.: РОССПЭН, 2008.-Т. 1.-С. 377.
7. Голнков, А.Г. Банкн н бмржа/А.Г. Голнков // Экономмческая нсторня Рошн (с древнейшмх времен до 1917 г.): энцнклопедмя: в 2 т. - М.: РОССПЭН, 2008. -Т. 1. - С. 155.
8. *Голнков, А.Г.* Бнржевые ведомостн / А.Г. Голнков // Эконо- мнческая нсторня Росснн (с древнейшнх времен до 1917 г.): энцмклопедмя: в 2 т. - М.: РОССПЭН, 2008. -Т. 1. - С. 231- 232.
9. Гомельскнй городской ломбард // Вестннк ломбардов. - 1910. — N° 22. — С. 353-354.
10. *Есин, Б.Н.* Русская дореволюцнонная газета: 1702-1917 / Б.Н. Еснн. - М.: 14зд-во МГУ, 1971. - 88 с.
11. *Коновалова, А.В.* Банковая н торговая газета / А.В. Коновалова // Экономнческая нсторня Россмн (с древнейшнх времен до 1917 г.): энцнклопедня: в 2т.-М.: РОССПЭН, 2008. - Т.1.-С. 158.
12. Кредnт н кооперацня. -1914. - № 1 -6.
13. *Лнсовскнй, Н.М.* Бnблнографня русской перноднческой печатн: 1703-1900 [Матерналы для мсторнм рус. журналнстакн]: в 2 т. / Н.М. Лнсовскнй. - М.: Лмт. обозрение, 1995. - 1066 с.
14. Ревмзня Мннского городского ломбарда // Московскнй вестннк ломбардов. -1913. - № 2-3. - С. 163.

ЗІІММАНУ

Т/?е агііcіе сіеаіз шііі ІГіе асіміiез оГ а гштЬег о? Гюапсіаl апб есопотіс рцЬlісаlіопз, шЬісі рлэмУез іпіоrтаііоп оп іГіе асіміiез оГlагdе соттегсіаі Ьапкз, тШlе апсі реііе сгеdіі іпзіШіопз. ТГіе аііiГіоr сіаззі- Гіез регіосііcаіз, dmез а dезсгіріоп о? іеіе тозі Гатоыз апсі зідпіЛсапі оі іГіет, зГіошз Гіош Лпапсіаl сарііаі іпПцепсесі апсі цзегі ііiе ргезз іо асЬlеvе ііiеіг dоаіз. ТГіе рарег зіюшз ііom/ іеіе тадагіпе апсі петзрарег Ьесоте а VаlцаЬlе зоыгсе оГ іпГоrтаііоп іоr Ьlзіоrіапз, Гіеір іо ібепііiу тіззіпd іпіоrтаііоп, іо ехрlаіп а сеrіаіп рrіепотепоп.

Паступіў у рэдакцыю 21.02.2011 г.

УДК 387(476)(091)«196/198»

**П.А. Мацюш,**
*выкладчык кафедры гісторыі Беларусі БДПУ*

## ВЫШЭЙШАЯ ГІСТАРЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў БССР (1960-я – ПЕРШАЯ ПАЛОВА 1980-х гг.): АНАЛІЗ СТРУКТУРЫ І ЗМЕСТУ

На сённяшні дзень працэс даследавання нельга ўявіць без выкарыстання сучасных навуковых метадаў. З іх дапамогай магчыма не толькі ахарактарызаваць стан аб'екта даследавання, але і яго развіццё.

У шырокім сэнсе развіццё – гэта працэс, які накіраваны на змяненне колькасных і якасных характарыстык аб'екта, яго ўдасканаленне. У дачыненні да вышэйшай гістарычнай адукацыі яго можна разглядаць як удасканаленне структуры, формы і зместу. Развіццё не заўсёды выступае як лінейны, непарыўны працэс. Сустракаюцца фактары, што могуць як садзейнічаюць, так і перашкаджаць прагрэсіўным тэндэнцыям.

*Мэта артыкула* – аналіз развіцця вышэйшай гістарычнай адукацыі ў БССР на працягу

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



1960-х – першай паловы 1980-х гг. у кантэксце сацыяльна-палітычных умоў і партыйна-дзяржаўнай палітыкі ў галіне адукацыі.

У разглядаемы перыяд фарміруецца ўстойлівая структура прафесійнай падрыхтоўкі гісторыка ў вышэйшай школе. Павялічваецца колькасць цэнтраў па падрыхтоўцы спецыялістаў-гісторыкаў і тэрміны навучання, больш разнастайнай становіцца наменклатура спецыяльнасцей. Калі ў пачатку 1960-х гг. настаўнікаў гісторыі рыхтавалі педагагічныя інстытуты Гродна, Мінска, Магілёва і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, то ў сярэдзіне 1980-х гг. кваліфікацыя выкладчыка гісторыі прысвойвалася і выпускнікам Гомельскага і Гродзенскага ўніверсітэтаў.

У Мінскім педагагічным інстытуце ў пачатку 1960-х гг. ажыццяўлялася падрыхтоўка па спецыяльнасці «Гісторыя і геаграфія». Па гэтай спецыяльнасці за перыяд з 1962 па 1967 г. было падрыхтавана 245 выпускнікоў [10, с. 91]. У 1961 г. адбыўся апошні выпуск па гісторыка-філалагічнай спецыяльнасці. У Магілёўскім педагагічным інстытуце за перыяд 1961–1965 гг. 264 чалавекі скончылі дзённае аддзяленне па спецыяльнасці «Гісторыя і геаграфія» [4, с. 212–215]. У Гродзенскім педінстытуце 327 чалавек з 1961 па 1967 г. сталі выпускнікамі гісторыка-філалагічнага факультэта [9, с. 11].

Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшым развіцці вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, паляпшэнні падрыхтоўкі і выкарыстання спецыялістаў» (1963 г.) прадугледжвалася: «Саветам міністраў саюзных рэспублік забяспечыць упарадкаванне і паскарэнне падрыхтоўкі настаўнікаў агульнаадукацыйных школ у педагагічных інстытутах, рыхтаваць іх, як правіла, па адной спецыяльнасці … з чатырохгадовым тэрмінам навучання». Вяртанне да шырокага профілю адбылося ў 1970-я гг., што абумоўлівалася кадравай праблемай.

У дакладной запісцы Мінскага педагагічнага інстытута Міністэрству вышэйшай і сярэдняй спецыяльнасці БССР увядзенне новай спецыяльнасці «Гісторыя і замежная мова» тлумачылася наступным чынам: «Нярэдка школьныя настаўнікі, якія былі пазбаўлены поўнай нагрузкі па сваёй спецыяльнасці, выкладалі замежную мову без адпаведнай падрыхтоўкі. У той жа час многія настаўнікі замежнай мовы не мелі поўнай нагрузкі і вымушаны выкладаць гісторыю і грамадазнаўства» [6, с. 30–31].

У адпаведнасці з Пастановай калегіі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, бюро ЦК ЛКСМБ і калегіі Міністэрства асветы БССР ад 18 мая 1967 г. «Аб падрыхтоўцы старшых піянерважатых і метадыстаў па піянерскай рабоце», з 1967 г. у Гродзенскім педагагічным інстытуце пачыналася падрыхтоўка настаўнікаў гісторыі, грамадазнаўства і метадыстаў па піянерскай рабоце са штогадовым прыёмам 50 чал. [20, л. 80]. Такім чынам, падрыхтоўка спецыяліста-гісторыка ў вышэйшай школе БССР прадугледжвала, акрамя набыцця прафесійных навыкаў, авалоданне методыкай арганізацыі партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай работы.

Гісторыка-педагагічны факультэт у Гродзенскім педагагічным інстытуце імя Я. Купалы працягваў функцыянаваць да 1978 г., да рэарганізацыі педінстытута ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт. У гэтым жа навучальным годзе на гістарычны факультэт па спецыяльнасці «Гісторыя» было прынята 125, у тым ліку 50 чалавек на стацыянар і 75 чалавек на завочнае аддзяленне. Тэрмін навучання на стацыянары складаў 5 гадоў, на завочным аддзяленні – 6 гадоў. Пашыраўся і спектр падрыхтоўкі спецыялістаў. На факультэце рыхтавалі выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства для сярэдняй агульнаадукацыйнай школы, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, супрацоўнікаў навукова-даследчых устаноў, што адпавядала ўзроўню ўніверсітэцкай адукацыі [8, с. 218–219].

З 1978 г. гістарычны факультэт Магілёўскага педінстытута перайшоў з чатырохгадовага на пяцігадовы тэрмін навучання. Пачалася падрыхтоўка кадраў па дадатковай спецыяльнасці «Правазнаўства». Увядзенне названай дадатковай спецыяльнасці тлумачылася тым фактам, што з 1975/76 навучальнага года з мэтай паляпшэння прававой асветы ў восьмых класах агульнаадукацыйнай школы пачаў выкладацца новы вучэбны прадмет – «Асновы савецкай дзяржавы і права». Дадзены курс павінен быў «уплываць на фарміраванне сацыялістычнай правасвядомасці і маральных норм паводзін вучняў, на павышэнне ўсёй выхаваўчай і прафілактычнай работы школы» [23, с. 181].

Яшчэ адным цэнтрам па падрыхтоўцы спецыялістаў-гісторыкаў з канца 60-х гг. мінулага стагоддзя становіцца Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт. З пераўтварэннем у 1969 г. Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя В.П. Чкалава ў класічны ўніверсітэт на гісторыка-філалагічным факультэце было створана гістарычнае аддзяленне [24, с. 177].

У першай палове 1960-х гг. на гістарычным факультэце БДУ ажыццяўлялася падрыхтоўка спецыялістаў з кваліфікацыяй «Настаўнік гісторыі сярэдняй школы з выкладаннем на замежнай мове». Студэнты мелі магчымасць слухаць асобныя курсы на замежнай мове. Апошні выпуск па гэтай спецыяльнасці адбыўся ў 1965/66 навучальным годзе [19, л. 22].

У 1966 г. на гістарычным факультэце БДУ пачалі функцыянаваць аддзяленні філасофіі і палітычнай эканоміі з пяцігадовым тэрмінам навучання і прысваеннем выпускнікам кваліфікацыі «эканаміст, выкладчык палітычнай эканоміі» і «філосаф, выкладчык філасофіі». Такую струк-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

турную рэарганізацыю можна растлумачыць, па-першае, імкненнем стварыць у рэспубліцы на базе ўніверсітэта буйны грамадазнаўчы цэнтр. Па-другое, па даных Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, большасць выкладчыкаў навуковага камунізму ў ВНУ рэспублікі не мела спецыяльнай філасофскай адукацыі, а сярод выкладчыкаў філасофіі была высокая ўдзельная вага філолагаў і гісторыкаў.

Прыярытэтнасць падрыхтоўкі кадраў у галіне гісторыі партыі праявілася ў тым, што спецыялізацыя па гісторыі КПСС на гістарычным факультэце БДУ была ператворана ў самастойную спецыяльнасць. Так, у 1983 г. на гістарычным факультэце з'явілася новая спецыяльнасць 2042 «Гісторыя КПСС». Па дзеючым палажэнні на аддзяленні філасофіі, палітэканоміі і гісторыі КПСС павінны былі прымацца асобы, якія мелі працоўны і жыццёвы вопыт, станоўча зарэкамендавалі сябе ў грамадскім жыцці. Перавага надавалася членам і кандыдатам у члены КПСС, а таксама камсамольскім актывістам, якія мелі схільнасць да грамадска-палітычных навук. Ім выдаваліся рэкамендацыі абкамаў партыі, а звольненым у запас ваеннаслужачым – палітаддзелаў [12, л. 5].

Павелічэнне кантынгенту студэнтаў у ВНУ БССР з'яўлялася адной з актуальных задач партыі і ўрада рэспублікі. Пастановай пленума ЦК КПБ 29–30 красавіка 1974 г. «Аб далейшым павышэнні дзейснасці ідэйна-палітычнай работы ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС» прадугледжвалася на працягу 10–15 гадоў павялічыць прыём на дзённую форму навучання ў ВНУ не менш чым у 1,6 раза [7, с. 527].

Рэалізацыя вышэйзгаданых задач прывяла да пашырэння падрыхтоўкі настаўнікаў з вышэйшай педагагічнай і ўніверсітэцкай адукацыяй. На гэта пастаянна звяртала ўвагу Міністэрства асветы БССР у сваіх рэгулярных інфармацыях і дакладных запісках у ЦК КПБ і Савет Міністраў рэспублікі. Калі ў 1967 г. педагагічныя інстытуты па спецыяльнасці «Гісторыя» ажыццявілі выпуск 162 чал. і 41 чал. БДУ, то 1984 г. дыпламаванымі спецыялістамі ў галіне гісторыі сталі 107 выпускнікоў педагагічных інстытутаў і 158 выпускнікоў універсітэтаў [21, л. 8–9; 22, л. 2, 59, 66]. Усяго з 1961 па 1985 г. спецыяльнасць «Гісторыя» дзённай формы навучання (уключаючы спецыяльнасці шырокага профілю ў педагагічных інстытутах) скончылі 6412 чал. З іх Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт – 1923 чал. [2, с. 176–202]., Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт – 486 чал.[1], Гродзенскі пединстытут і ўніверсітэт – 1317 чал. [9, с. 11–12], Магілёўскі пединстытут – 1075 чал. [4, с. 212–223], Мінскі пединстытут – 1611 чал. [6, с. 89].

[1] Падлічана аўтарам па даных Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР

Аналіз вучэбных планаў дазволіў вызначыць змест прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста-гісторыка ў вышэйшай школе. Партыйная ўстаноўка на глыбокае веданне марксісцка-ленінскай тэорыі грамадскага развіцця прывяла да ўзмацнення грамадазнаўчай падрыхтоўкі спецыяліста-гісторыка. Гэтаму садзейнічала таксама ўвядзенне курса грамадазнаўства ў выпускных класах сярэдніх школ у пачатку 1960-х гг. [11, л. 77]. У 1970-я гг. поўнасцю аформіліся дзяржаўныя падыходы комплекснага камуністычнага выхавання студэнтаў. З 1974/75 навучальнага года ўведзены дзяржаўны экзамен па навуковым камунізме ва ўсіх ВНУ, выкладанне грамадскіх навук на працягу ўсяго перыяду навучання, павелічэнне тэрміну вывучэння марксісцка-ленінскай філасофіі да двух гадоў.

У вучэбных планах, якія былі зацверджаны Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР у 1970-я гг., на блок спецыяльных гістарычных дысцыплін у педагагічных інстытутах адводзілася 1730 гадзін і 2 706 гадзін ва ўніверсітэтах. Павялічыўся час на вывучэнне розных перыядаў айчыннай і сусветнай гісторыі, асабліва гісторыі СССР. Больш гадзін стала адводзіцца на дысцыпліны спецыялізацый па гісторыі ва ўніверсітэтах. Узмацненнем прафесійнай падрыхтоўкі гісторыка можна лічыць пачатак выкладання курса гістарыяграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін.

З трэцяга курса ва ўніверсітэтах студэнты размяркоўваліся ў адпаведнасці са сваімі інтарэсамі па групах спецыялізацый для больш глыбокага вывучэння аднаго з кірункаў гістарычнай навукі. Спецыялізацыя выступала адным з фактараў развіцця навукова-даследчай работы студэнтаў і падрыхтоўкі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі. Згодна з загадам Міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР ад 21 верасня 1964 г. № 300, спецыялізацыя ажыццяўлялася па такіх напрамках, як гісторыя СССР, усеагульная гісторыя, археалогія, музеязнаўства, архівазнаўства, этнаграфія, гісторыя рэлігіі і навуковы атэізм [18, л. 306].

Станоўчым рашэннем партыйных і дзяржаўных органаў улады СССР стала арганізацыя вывучэння гісторыі саюзнай рэспублікі. Саюзным рэспублікам давалася права самім вызначаць, якім чынам арганізаваць гэты працэс. Такое рашэнне адкрывала новыя магчымасці для вывучэння нацыяльнай гісторыі, стварэння падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для школ навукова-педагагічнымі калектывамі вышэйшых навучальных устаноў. Упершыню ў гісторыі Беларусі ўзнікла магчымасць самастойна вызначыць парадак вывучэння айчыннай гісторыі [1, с. 53].

Характэрнай асаблівасцю савецкай партыйна-дзяржаўнай палітыкі ў галіне вышэйшай адукацыі ў 1960-х – першай палове 1980-х гг. з'явілася скаардынаваная дзейнасць органаў пар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version



тыйнага і дзяржаўнага кіравання: КПСС–КПБ, саюзнага і рэспубліканскага Міністэрстваў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, Міністэрстваў асветы. Адукацыйны працэс будаваўся на прынцыпе адзінства, што пацвярджалася рэгулюючымі дакументамі.

Так, пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па паляпшэнні падрыхтоўкі спецыялістаў і ўдасканаленні кіраўніцтва вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў краіне» (1966 г.) садзейнічала якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, пераадоленню недахопаў у галіне вучэбна-педагагічнай, палітыка-выхаваўчай і навукова-даследчай дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў. У пастановах партыі і ўрада СССР «Аб мерах па далейшым удасканаленні вышэйшай адукацыі ў краіне» (1972 г.) і «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» (1979 г.) асаблівая ўвага надавалася паляпшэнню якасці ідэйна-палітычнага выхавання кадраў, умацаванню сувязі з вытворчасцю, практыкай камуністычнага будаўніцтва. З мэтай паспяховага вырашэння пастаўленых задач вышэйшай школе прадпісвалася павышаць тэарэтычны ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў шырокага профілю, удасканальваць змест і метады навучання і выхавання. Уздымалася роля ўніверсітэтаў як вядучых вучэбна-метадычных і навуковых цэнтраў вышэйшай школы. Павышалася адказнасць кафедр за светапоглядную накіраванасць вучэбна-выхаваўчай работы. У сістэме ВНУ яны з'яўляліся галоўным звяном у забеспячэнні адзінства вучэбнага, навуковага і выхаваўчага працэсу [3, с. 4–5].

Развіццё вышэйшай гістарычнай адукацыі ў многім залежыць ад навукова-педагагічных кадраў, узроўню іх кваліфікацыі. На працягу вывучаемага перыяду існавалі такія формы падрыхтоўкі кадраў гісторыкаў вышэйшай навуковай кваліфікацыі як аспірантура (дзённая, завочная, мэтавая, аднагадовая), саіскальніцтва, прадастаўленне творчых адпачынкаў, падрыхтоўка стажораў-выкладчыкаў. Аспірантура была крыніцай сістэматычнага папаўнення ўніверсітэтаў і інстытутаў навукова-педагагічнымі кадрамі.

Актывізацыі навукова-даследчай работы педагагічных інстытутаў садзейнічала рэарганізацыя і стварэнне новых кафедр гісторыі. Так, у Мінскім пединстытуце ў 1971 г. была адкрыта кафедра гісторыі БССР, якую ўзначаліла член-карэспандэнт АН БССР, прафесар Н.В. Каменская. У БДУ ў 1973 г. была арганізавана кафедра археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін. Там жа ў 1974 г. на базе кафедры гісторыі СССР былі створаны кафедра гісторыі СССР дасавецкага перыяду і кафедра гісторыі СССР эпохі сацыялізму. У Гродзенскім пединстытуце ў пачатку 1973/74 навучальнага года была створана самастойная кафедра ўсеагульнай гісторыі. У 1981 г. – кафедра гісторыі СССР і БССР і была падзелена на дзве кафедры: гісторыі СССР і гісторыі БССР [9, с. 9]. У Гомельскім дзяржаўным універсітэце ў 1984 г. кафедра гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі была падзелена на дзве самастойныя кафедры: гісторыі СССР і БССР, а таксама ўсеагульнай гісторыі [24, с. 234].

Заканамерным працэсам стаў колькасны і якасны рост саставу гістарычных кафедр. Так, у Мінскім педагагічным інстытуце ў 1961/62 навучальным годзе на кафедрах гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі працавалі 10 чал.: 1 доктар навук, прафесар, 5 кандыдатаў навук, дацэнтаў, 3 старшых выкладчыкі, 1 выкладчык [13, л. 24; 14, л. 53]. У 1981/82 навучальным годзе на гэтых жа кафедрах і на кафедры гісторыі БССР і методыкі выкладання гісторыі навукова-педагагічную дзейнасць ажыццяўлялі 21 чал.: 2 дактары навук, прафесары, 13 кандыдатаў навук, дацэнтаў, 3 старшыя выкладчыкі, 3 выкладчыкі [15, л. 71; 16, л. 145; 17, л. 6].

Сацыяльна-палітычныя ўмовы значна ўплывалі і на арганізацыю навуковых даследаванняў у галіне гісторыі. Творчыя сілы гісторыкаў у першую чаргу канцэнтраваліся ў напрамку распрацоўкі гісторыка-партыйнай тэматыкі, аб чым сведчыць размеркаванне дысертацый па кірунках даследаванняў (табліца).

***Табліца* – Дысертацыі, абароненыя ў сістэме ВНУ БССР (1961–1985 гг.)**

| | Гісторыя КПСС і КПБ | Гісторыя СССР і БССР | Усеагульная гісторыя | Журналістыка |
|---|---|---|---|---|
| Доктарскія | 9 | 9 | 5 | 2 |
| Кандыдацкія | 187 | 64 | 44 | 20 |

З 1961 па 1985 г. беларускімі гісторыкамі ў навуковых і вышэйшых навучальных установах БССР і СССР былі падрыхтаваны і абаронены 734 доктарскія і кандыдацкія дысертацыі [5, с. 31–111]. Гісторыка-партыйная тэматыка істотна перавышала колькасць дысертацый па іншых аспектах гістарычных даследаванняў.

Такім чынам, развіццё вышэйшай гістарычнай адукацыі ў БССР характарызавалася ростам колькасці настаўніцкіх і навукова-педагагічных кадраў гісторыкаў, узмацненнем іх практычнай і тэарэтычнай падрыхтоўкі. Удасканальвалася структура і формы падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў, якія істотна не закранулі зместу вышэйшай гістарычнай адукацыі. Гістарычная спецыяльнасць дапоўнілася больш грунтоўнай грамадазнаўчай, лінгвістычнай, педагагічнай і праваазнаўчай падрыхтоўкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

